# 23 ЛЮТАГА — 58 ГОД СЛАЎНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ



У 58-ы раз увесь савецкі народ адзначае вялікую падзею — дзень стварэння Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. За 58 год Чырвоная Армія прайшла вялікі шлях свайго станаўлення і развіцця. Ужо на франтах грамадзянскай вайны яна паказала сваю сілу і непераможнасць. У сваіх радах яна выхавала выдатных палкаводцаў, якіх ведае ўвесь свет.

Пільна стаялі сыны Савецкай Арміі на ахове мірнага жыцця, вялікіх заваёў сацыялістычнага будаўніцтва. У гадзіну новага выпрабавання—у Вялікую Айчынную вайну — яны зноў пацвердзілі сваю магутнасць і непераможнасць. Многа, вельмі многа байцоў не вярнулася з вайны. Яны аддалі сваё жыццё для таго, каб нам жылося светла і радасна. Мы, сучаснае пакаленне, ніколі не забудзем гэтага, будзем заўсёды ім удзячны.

58-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту савецкі народ адзначае ў знамянальны час— напярэдадні XXV з'езда Камуністычнай партыі. Калектыў нашай навучальнай установы, як і ўсе працоўныя, прыкладае шмат намаганняў, каб з гонарам выканаць вялікія задачы, вызначаныя партыяй на дзесятую пяцігодку.


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (1118) ● Чацвер, 19 лютага 1976 г. ● ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.


## ЛЕПШЫЯ ВЫНІКІ — З'ЕЗДУ

Усхваляваныя, яны сядзяць у гэтай зале. Сёння ў студэнтаў фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна свята: яны ўдастоіліся гонару падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС. Добрасумленнай працай і стараннай вучобай фізфакаўцы дабіліся права называцца лепшым факультэтам універсітэта.

Пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва віншуюць дэкан факультэта І. П. Зяцькоў, сакратар партбюро факультэта П. Я. Салаў, студэнты. Урачыста гучаць словы пажаданняў поспехаў у вучобе, працы, новых адкрыццяў, пошукаў. Задача штодзённага павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў павінна быць выканана на выдатна. У поўную меру сіл дапамогу ў гэтым акажуць самі студэнты, аддана працуючы ў новай, дзесятай пяцігодцы — пяцігодцы якасці.

Тэкст Рапарта зачытвае лепшы студэнт фізфака, ленінскі стыпендыят Г. Стэльмах. Усхвалявана гучыць у цішыне яго голас: «...У камсамольцаў няма нічога больш узвышанага і высакароднага, чым служыць справе Леніна... Мы абяцаем зрабіць кожны свой дзень карысным для грамадства...»

Некалькі збянтэжаныя, з радаснымі ўсмешкамі на тварах, падыходзяць хлопцы і дзяўчаты да стала, ставяць пад тэкстам свае асабістыя подпісы. Сакратар камітэта камсамола БДУ А. А. Тозік уручае пераможцам кніжкі «Вучыцца камунізму», знакі ЦК ВЛКСМ «Малады гвардзеец пяцігодкі» і «Ударнік-75». Ён віншуе рабят і жадае ім і надалей трымаць сцяг пераможцаў, вучыцца толькі на «выдатна», самааддана працаваць, каб унесці дастойны ўклад у выкананне дзесятай пяцігодкі. Дэвізам павінны стаць словы: «Ніводнага адстаючага побач!»

Рабяты апраўдаюць давер факультэта, бо інакш ім нельга: на іх раўняюцца ўсе студэнты.

**С. ІВАНОВА.**

## САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

Пры камітэце камсамола БДУ створаны савет маладых вучоных. Яго мэта — садзейнічаць парткому, рэктарату, камітэту камсамола ў рабоце па камуністычнаму выхаванню навуковай моладзі, у павышэнні ёю навуковай і грамадска-палітычнай актыўнасці, умацаванні сувязей паміж маладымі вучонымі нашай установы, а таксама з маладымі вучонымі іншых ВНУ краіны.

Ва універсітэце саветы маладых вучоных ствараюцца пры камітэтах (бюро) камсамола факультэтаў. Састаў гэтых саветаў зацвярджаецца дэканатам або дырэктарам навуковай установы універсітэта і адпаведным бюро камітэта камсамола на два гады. Гэтыя саветы працуюць пад кіраўніцтвам савета маладых вучоных БДУ.

Савет маладых вучоных мае права праводзіць навуковыя канферэнцыі, семінары, школы па актуальных тэмах, публікаваць матэрыялы гэтых мерапрыемстваў у «Весніку БДУ», рэкамендаваць работы маладых вучоных універсітэта для публікацыі ў навуковых і навукова - папулярных часопісах, у зборніках, а таксама рэкамендаваць лепшыя работы на гарадскія, рэспубліканскія і ўсесаюзныя конкурсы.

Савет маладых вучоных можа рэкамендаваць работы на атрыманне прэміі Ленінскага камсамола ў галіне навукі, тэхнікі і мастацтва, прэміі Акадэміі навук СССР, навукова-тэхнічных таварыстваў і іншых арганізацый; рэкамендаваць маладых вучоных для чытання лекцый па агульных і спецыяльных дысцыплінах у ВНУ краіны.

Савет маладых вучоных абавязаны дапамагаць навуковай моладзі ў павышэнні яе навуковай і грамадска - палітычнай актыўнасці, дапамагчы ў стварэнні першасных арганізацый маладых вучоных універсітэта, зацвярджаць планы іх работы; штогод праводзіць тэматычную або агульную канферэнцыю; шырока інфармаваць грамадскасць аб сваёй рабоце; штогод праводзіць сход актыву савета з удзелам усіх членаў савета і старшынь першасных арганізацый; рэгулярна даваць справаздачу аб сваёй рабоце рэктарату і камітэту ЛКСМБ універсітэта.

У састаў савета маладых вучоных нашай установы ўвайшлі наступныя супрацоўнікі:

**Т. М. Пушкарова** — старшыня савета, кандыдат хімічных навук;

**К. М. Бяляўскі** — малодшы навуковы супрацоўнік праблемнай лабараторыі эксперыментальнай біялогіі;

**А. Н. Звонак** — кандыдат хімічных навук, малодшы навуковы супрацоўнік кафедры ВМЗ;

**А. З. Зелянкоў** — кандыдат філасофскіх навук, старшы выкладчык кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў;

**М. М. Кавалёў** — кандыдат фізіка - матэматычных навук, дацэнт кафедры матэматычнага забеспячэння АСК;

**П. А. Каўрыга** — кандыдат геаграфічных навук, асістэнт кафедры фізічнай геаграфіі СССР;

**С. В. Конанаў** — выкладчык кафедры геаметрыі механіка - матэматычнага факультэта;

**С. А. Паваляеў** — загадчык сектара НТІ;

**А. І. Цітова** — кандыдат філалагічных навук, выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі;

**А. А. Тозік** — кандыдат гістарычных навук, сакратар камітэта камсамола БДУ;

**Т. І. Шамякіна** — кандыдат філалагічных навук, выкладчык кафедры беларускай літаратуры;

**Г. А. Шумак** — выкладчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта;

**Л. П. Яноўская** — старшы інспектар аддзела аспірантуры;

**В. І. Мікуловіч** — кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік фізічнага факультэта;

**Т. Ф. Даніленка** — малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП;

**Е. І. Новікава** — кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі.

Бюро савета маладых вучоных:

**Т. М. Пушкарова** — старшыня;

**В. І. Мікуловіч** — намеснік старшыні па навуковай рабоце;

**А. З. Зелянкоў** — намеснік старшыні па ідэалагічнай рабоце;

**А. А. Тозік** — сакратар камітэта камсамола БДУ;

**Т. Ф. Даніленка** — вучоны сакратар.

## У САВЕЦЕ

*На апошнім пасяджэнні савета універсітэта, якое адбылося на мінулым тыдні, было абмеркавана пытанне «Аб стане вучэбна-выхаваўчай работы на геаграфічным факультэце і мерах па далейшаму паляпшэнню кантролю за арганізацыяй і ходам вучэбнага працэсу».*

*З дакладамі па гэтаму пытанню выступілі дэкан геаграфічнага факультэта, прафесар М. Т. Раманоўскі і прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня арганізацыйна - метадычнай камісіі па кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў, прафесар У. Р. Івашын.*

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ У ВУЧОНЫМ ЗВАННІ

### ПРАФЕСАРА:

**СВІРЫДАЎ ВАДЗІМ ВАСІЛЬЕВІЧ** (кафедра неарганічнай хіміі).

### ДАЦЭНТА:

**ПЕШЧАНКА АНАТОЛІЙ ДЗМІТРЫЕВІЧ** (кафедра радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі).

**СІДЭРКА ВАЛЯНЦІНА МІХАЙЛАЎНА** (кафедра хіміі высокамалекулярных злучэнняў).

**ДУДЗІНСКІ ЛЯОНЦІЙ СЦЯПАНАВІЧ** (кафедра марксісцка - ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў).

**ЕЛСУКОЎ АЛЬБЕРТ МІКАЛАЕВІЧ** (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў).

**МУЛЯРЧЫК СЦЯПАН РЫГОРАВІЧ** (кафедра радыёфізікі і электронікі ЗВЧ).

**ПАСЛЯДОВІЧ МІХАІЛ РАМАНАВІЧ** (кафедра фізічнай оптыкі).

**ЧАРАНКОВА ЛЮДМІЛА ПАЎЛАЎНА** (кафедра вышэйшай матэматыкі).

**ЛЮЦКО АЛЯКСАНДР МІХАЙЛАВІЧ** (кафедра ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі).

**МУРЫНА ЛАРЫСА АЛЯКСАНДРАЎНА** (кафедра рускай мовы).




*Не будзе перабольшаннем сказаць, што самай вялікай папулярнасцю ў Мінску карыстаецца Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Хто б ні прыехаў у сталіцу Беларусі, заўсёды стараецца наведаць яго прасторныя светлыя залы.*

*На сценах здымкі, дакументы — сведкі велічы і непераможнасці нашай слаўнай Чырвонай Арміі. Маўкліва застыла ў кутках баявая тэхніка. Усё тут уражвае, прымушае хвалявацца. Абыякавых няма: і сівыя старыя людзі, якія самі былі ўдзельнікамі баёў, і моладзь, што ведае аб вайне толькі з расказаў, — усе падоўгу затрымліваюцца ля экспанатаў.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*



*Матэрыялы, прысвечаныя 58-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, чытайце на 2-й старонцы.*

